**Яшнікава, Н.** Браты-«афганцы» // Браслаўская звязда. — 2006. — 15 лют. — С. 2.

## БРАТЫ-«АФГАНЦЫ»



***Міхаіл і Мікалай Туляевы***

Дзевяць гадоў доўжылася вайна ў Афганістане. У ёй удзельнічалі і 105 ураджэнцаў нашага раёна. Сярод іх і два былыя вучні Літоўшчынскай школы, родныя браты Туляевы. Па ўспамінах настаўнікаў, яны былі хлопцамі з добрай фізічнай загартоўкай, займаліся спортам, любілі хадзіць у паходы, захапляліся турызмам. Час іх мужчынскага сталення выпаў якраз на гады, калі на далёкай афганскай зямлі ішлі ваенныя дзеянні.

Старэйшы з братоў Мікалай праходзіў службу ў Афганістане ў горадзе Гордэс, што ў 100 км ад Кабула, з красавіка 1985 года па лістапад 1986 г. Быў ён начальнікам тэлефоннай радыёлінейнай станцыі.

Яшчэ не вярнуўся з арміі Мікалай, а бацькі праводзілі на службу другога сына – Міхаіла. Хто тады мог уявіць сабе, што і ён трапіць у самае пекла вайны і прыйдзе на змену брату. Свой воінскі інтэрнацыянальны абавязак М. Туляеў выконваў з кастрычніка 1986 па ліпень 1988 года ў 60 км ад граніцы з Пакістанам. Дзякуй Богу, абодва Туляевы вярнуліся дамоў з той далёкай вайны жывымі. Але не загойваюцца да гэтай пары душэўныя раны. Юнакі, панюхаўшыя пораху, глядзеўшыя не раз у вочы смерці, і сёння са слязамі на вачах узгадваюць падзеі, якія крывавымі слядамі бязлітасна прайшлі па іх лёсу. Яны не любяць расказваць пра той перыяд жыцця. Але аб тым, што ён быў нялёгкім, гавораць шматлікія ўзнагароды. Два медалі «За баявыя заслугі» мае Міхаіл. У абодвух братоў медалі «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа» і «У памяць 10-годдзя вываду Савецкіх войскаў з Афганістана», граматы Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Воіну-інтэрнацыяналісту».

Мікалай Туляеў у 1996 годзе быў дэлегатам Усебеларускага народнага сходу.

Цяпер браты працуюць механізатарамі ў СВК «Неспіш».

Я нарадзілася пасля афганскай вайны. Пра яе толькі чытала ды іншы раз чула некалькі слоў ва ўспамінах бацькі, які таксама выконваў свой інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане.

Вайна тая закончылася для гісторыі, але ні ў якім разе не для яе сведкаў і ўдзельнікаў.

**Н. Яшнікава**,

вучаніца Літоўшчынскай школы